**Т. Н. Щеглова**,
учитель белорусского языка и литературы
гимназии г. Добруша

# Самастойны выбар у свеце каштоўнасцей

## Арганізацыя выхаваўчага ўзаемадзеяння з вучнямі на ўроках беларускай літаратуры праз выкарыстанне фактаў жыццядзейнасці вядомых асоб

*Мой педагагічны вопыт пераконвае, што для асноўнай масы сучаснай моладзі характэрны нізкі агульнакультурны, сацыяльны, камунікатыўны, прафарыентацыйны ўзровень. Як палепшыць сітуацыю?*

Канцэпцыя выхавання дзяцей і моладзі ў РБ арыентуе настаўнікаў на стварэнне ўмоў для асэнсавання маладымі людзьмі вышэйшых духоўных каштоўнасцей, фарміравання свайго ўяўлення пра чалавека, сэнс жыцця, шчасце, міласэрнасць, гонар, дабро. На дапамогу прыходзіць мастацкая літаратура, якая, як вядома, з'яўляецца скарбонкай жыццёвых сітуацый і чалавечых характараў, сродкам эстэтычнага спасціжэння жыцця, яго маральных нормаў і якасцей. На маю думку, вялікую ролю ў выхаванні падрастаючага пакалення адыгрывае таксама зварот на ўроках беларускай літаратуры да фактаў жыццядзейнасці вядомых асоб культуры, палітыкі, спорту і г.д.

У працэсе выхавання моладзі заўсёды звярталіся да жыццёвага прыкладу вядомых людзей. Выхаванне на прыкладзе – адзнака традыцыйнай педагогікі, калі навучэнец павінен быў прымаць узор паводзін вядомай асобы як правіла. На сучасным этапе для выхавання асобы вучня прапануюцца прыклады жыццядзейнасці вядомых асоб не для таго, каб уззброіць вучняў гатовымі эталонамі для сляпога пераймання, а для таго, каб палегчыць ім самастойны выбар у свеце каштоўнасцей, падштурхнуць да асабістага духоўнага развіцця.

На ўроках беларускай літаратуры падчас прачытання і аналізу мастацкіх твораў мэтазгодна прыводзіць прыклады з жыцця рэальных людзей, якія па маштабе жыцця, творчасці ці асобных учынкаў змаглі падняцца на ўзровень вышэйшы за звычайны і могуць выступаць у якасці ўзору для вучняў. Пры асэнсаванні чужога жыццёвага вопыту ўнутраны свет вучняў пастаянна працуе: ідзе абдумванне інфармацыі, карэкціруюцца светапогляды, будуюцца

новыя стратэгіі, фарміруюцца розныя каштоўнасці. Такі ўрок выйгрышны ў тым плане, што праводзіцца сувязь з такімі дысцыплінамі, як грамадствазнаўства, гісторыя і нават псіхалогія, што пашырае межы прадмета «Беларуская літаратура». На ўроку разглядаюцца рэальныя жыццёвыя сітуацыі, а вучань успрымае іх не як звесткі для запамінання, а як веды, якія ён асэнсоўвае і можа выкарыстаць у жыцці. Пры арганізацыі такога ўрока трэба прытрымлівацца правілаў.

1. Праца праводзіцца ў канцы этапу вывучэння новага матэрыялу **перад рэфлексіяй**.
2. Пры вывучэнні пэўнага літаратурнага твора выбіраецца персанаж з пэўнымі рысамі характару і манерай паводзін.
3. Пад выбраны персанаж падбіраецца рэальная асоба з падобнымі рысамі характару, манерай паводзін, лёсам.

| Аўтар/твор | Персанаж | Вядомая асоба |
|---|---|---|
| В.Быкаў «Жураўліны крык» | Віктар Свіст | Уладзімір Карват |
| З.Бядуля «Бондар» | Даніла | Павел Сухой |
| М.Танк «Люцыян Таполя» | Л.Таполя | Сцівен Спілберг |
| Я.Брыль «Memento mori» | пячнік | Януш Корчак |
| В.Карамазаў «Дзяльба кабанчыка» | Сцяпан | Марк Шагал |
| А.Дудараў «Князь Вітаўт» | Вітаўт | Пётр Машэраў |
| І.Шамякін «Сэрца на далоні» | К.Шыковіч | Жарэс Алфёраў |
| К.Крапіва «Хто смяецца апошнім» | Чарнавус | Канстанцін Ушынскі |
| І.Мележ «Людзі на балоце» | Васіль і Ганна | Антон Макаранка |

Заўвага! Прыклады вядомых асоб для разгляду могуць быць іншымі.

4. Выбіраецца спосаб узаемадзеяння з вучнямі для актывізацыі ўнутраных механізмаў духоўнага росту вучняў.

«Я-канцэпцыя». Дазваляе ацаніць узровень свайго самаразвіцця па прапанаваных пытаннях па шкале (1-дрэнна, 2-добра, 3-выдатна) і выпрацаваць праграму дзеянняў на перспектыву. Крытэрыі: +1 – адзначаецца прагрэс у развіцці, 0 – развіццё практычна не заўважаецца, -1 – развіццё яўна пагоршылася.

| Пытанні для роздуму | Я ў мінулым | Я сёння | Я ў будучым |
|---|---|---|---|
| 1. Я заўсёды дабіваюся мэты | | | |
| 2. Маю захапленні, творчыя інтарэсы | | | |
| 3. Удасканальваю асабістыя якасці | | | |
| 4. Не дапускаю памылак прошлага | | | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 5. Ёсць асабістыя поспехі | | | |

«Вуглы». Дазваляе фарміраваць светапогляд вучняў.

Распрацоўваецца серыя пытанняў з варыянтамі адказаў. Кожнаму адказу прыпісваецца пэўны вугал аўдыторыі і колер. Настаўнік прапануе пытанне, вучні выбіраюць варыянт адказу, а значыць, вугал і колер. Калі ж ні адзін з адказаў не падыходзіць вучню, ён становіцца ў цэнтр аўдыторыі. Пасля таго як усе вучні зрабілі свой выбар і разышліся па вуглах ці сталі ў цэнтр, яны тлумачаць свой выбар, абменьваюцца думкамі. Пры кожным новым пытанні адбываецца перагрупіроўка ўдзельнікаў. Рэфлексія: чаму вучыць гульня?

«Майстэрня». Дазваляе раскрыць асабісты жыццёвы вопыт вучняў, зацікавіць калектыўным пошукам.

*Парадак правядзення.* Клас дзеліцца на групы. Прапануюцца пытанні.

1. Над першым пытаннем кожны вучань разважае індывідуальна.
2. Над другім пытаннем разважае ўся група.
3. Усё, што зроблена індывідуальна і ў групе, павінна быць афішыравана ўсяму класу.
4. Удзельнікі супастаўляюць свой і чужы пункт погляду на праблему.
5. Рэфлексія: пра што новае вы сёння даведаліся?

«Мазгавы штурм». Дазваляе выпрацоўваць асабістую думку па прапанаваным пытанні.

*Парадак правядзення.* Ставіцца цікавае праблемнае пытанне. Настаўнік рыхтуе карткі. Іх колькасць роўная колькасці ўдзельнікаў. На картках напісаны фразы, якія трэба закончыць: «Я раней не задумваўся пра гэта, але цяпер магу сказаць, што…», «Для мяне гэта пытанне не з'яўляецца складаным…», «Мне здаецца, што ў гэтым пытанні галоўным з'яўляецца…» і інш. Рэфлексія: чые думкі былі самымі цікавымі?

«Конкурс афарызмаў». Разлічана на падтрымку самапазнання і самарэгуляцыі асобы вучняў.

*Парадак правядзення.* Прапануецца закончыць фразы: «Творчасць – гэта не толькі…, але і …», «Спазнаць сябе – значыць…», «Самавыхаванне – гэта…», «… – крэда майго жыцця», «Вышэйшая ступень дасканаласці – гэта…», «Годнасць чалавека вымяраецца…», «Жыць па сумленні – гэта…», «Лепш ужо…, чым…».

Пасля прапануецца закончыць афарызмы вялікіх людзей: «Добра ці…» (Ферэнц Ліст), «Пакуль дыхаю – …» (Ламарцін), «Нічога праз …» (Солан), «Абавязаны – значыць …» (А. Сувораў) і іншыя. Рэфлексія: які афарызм можа стаць вашым жыццёвым дэвізам?

«Дэбаты». Дапамагаюць фарміраваць светапогляд вучняў, вучыць адстойваць сваю думку.

Размяшчэнне ўдзельнікаў дэбатаў: справа ад настаўніка – абаронцы тэзіса (4 чалавекі), злева – праціўнікі тэзіса (4 чалавекі), пасярэдзіне –вучні без пэўнай кропкі гледжання.

*Парадак правядзення.* Па чарзе выступаюць прадстаўнікі за і супраць. Галасаванне: пасля выступленння прамоўцаў за і супраць вучні без пэўнай

кропкі гледжання далучаюцца да абаронцаў тэзіса ці апазіцыі. Рэфлексія: ці актуальны тэзіс дэбатаў?

«Інверсія». Дазваляе паглядзець на пытанне з супрацьлеглага боку і ацаніць сітуацыю, фарміруе ўменне прымаць рашэнне ў сітуацыях выбару. Выкарыстоўваюцца наступныя моўныя парадыгмы: «Уявіце, што гэтага не было б…», «Што магло б быць, калі б яна (ён) не зрабіў так…».

«Дрэва мэтаў». Дазваляе вучыць ставіць перад сабой блізкія і далёкія мэты.

*Парадак правядзення.*

1. Вучні вызначаюць для сябе мэты.
2. Будуецца «дрэва мэтаў».
3. Класіфікуюцца мэты: а)па важнасці, б)верагоднасці выканання, в)ад каго залежаць.
4. Распішыце мэты: а)на перспектыву, б)на год, в)на месяц, г)на тыдзень, д)на дзень.
5. Выключыць мэты, без якіх можна абысціся.

Такім чынам, атрымаўся план жыцця.

«Уявіце». Дазваляе прымаць рашэнні ў сітуацыях маральнага выбару. Вучні трапляюць ва ўмоўную (уяўляемую) сітуацыю. Ім прапануецца апісаць карціну таго, што адбудзецца, калі нешта зменіцца.

5. Робіцца рэфлексія. Пры гэтым уся праца на ўроку павінна быць звязаны з тэмай урока і персанажам твора.

Фрагмент ўрока з выкарыстаннем фактаў жыццядзейнасці вядомых асоб.

| | |
|---|---|
| Аўтар/ твор | Кузьма Чорны «Макаркавых Волька» |
| Персанаж | Волька |
| Характар, манера паводзін персанажа | Гуманістычная пазіцыя гераіні, чалавекалюбства, адданасць сваёй прафесіі, настойлівасць. |

<table>
<tr><td>Факты жыццядзейнасці вядомай асобы</td><td>Леанід Рашаль. Нарадзіўся ў 1933 г.. У 1957 г. скончыў лячэбны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута. Накіраваны на працу дзіцячым доктарам. З 2003 г. займае пасаду дырэктара Маскоўскага НДІ неадкладнай дзіцячай хірургіі і траўматалогіі. З'яўляецца прэзідэнтам Міжнароднага дабрачыннага фонду дапамогі дзецям пры катастрофах і войнах. Л.Рашаль упершыню ініцыіраваў стварэнне мабільных хірургічных брыгад для аказання дапамогі дзецям у гарачых кропках. У 1988 г. удзельнічаў у выратаванні дзяцей, якія пацярпелі пад час землетрасення ў Арменіі. Прымаў удзел у аказанні дапамогі дзецям Грузіі, Алжыра, Індыі, Японіі, Егіпта, Пакістана, Афганістана, Турцыі, Гаіці (пасля землетрасення), Башкірыі (пасля чыгуначнай катастрофы), Югаславіі, Нагорнага Карабаха, Румыніі, Ірака (падчас ваенных канфліктаў).У 1995 г. журналісты назвалі Леаніда Рашаля Дзіцячым доктарам свету, ён узнагароджаны шматлікімі ордэнамі і медалямі. У 2007 г. вядомы хірург намінаваны на Нобелеўскую прэмію.</td></tr>
<tr><td>Спосаб узаемадзеяння з вучнямі</td><td>Я-канцэпцыя самаразвіцця<br>Л. Рашаль – чалавек адданы сваёй справе і таленавіты кіраўнік. Якім рысам свайго характару ён абавязаны сваім поспехам? Растлумачце. Паглядзіце на розныя бакі свайго «Я» ў мінулым, сучасным і будучым. Ацаніце ўзровень свайго самаразвіцця па прапанаваных пытаннях па шкале (1-дрэнна, 2-добра, 3-выдатна) і пастарайцеся выпрацаваць сваю праграму дзеянняў на перспектыву.
<table>
<tr><th>Пытанні для роздуму</th><th>Я ў прошлым</th><th>Я сёння</th><th>Я ў будучым</th></tr>
<tr><td>1. Я заўсёды дабіваюся мэты</td><td></td><td></td><td></td></tr>
<tr><td>2. Маю захапленні, творчыя інтарэсы</td><td></td><td></td><td></td></tr>
<tr><td>3. Удасканальваю асабістыя якасці</td><td></td><td></td><td></td></tr>
<tr><td>4. Не дапускаю памылак прошлага</td><td></td><td></td><td></td></tr>
<tr><td>5. Ёсць асабістыя поспехі</td><td></td><td></td><td></td></tr>
</table></td></tr>
</table>

| | |
|---|---|
| Рэфлексія | Крытэрыі: +1 – адзначаецца прагрэс у развіцці, 0 – развіццё практычна не заўважаецца, -1 – развіццё яўна пагоршылася. Зрабіце вывады.<br>**Пытанні і заданні.**<br>1).Дзейнасць гераіні апавядання Волькі і біяграфія знакамітага доктара Рашаля: што агульнае?<br>2).Ці можа ў наш час чалавек быць гуманістам?<br>3).Закончыце думку: быць адданым сваёй справе – гэта значыць…<br>4).Працягніце сказ: я не задумваўся раней, што… |

Выкарыстанне такіх спосабаў педагагічнага ўзаемадзеяння пабуджае маладых людзей да асэнсавання і фармуліроўкі мэты жыцця, навучання, працы; аналізу сваіх поспехаў і няўдач у дзейнасці, зносінах з людзьмі; выпрацоўкі рэжыму працы і адпачынку; кантролю эмоцый; адказнасці пры выбары прафесіі.

Вынікам работы на ўроку можна стаць напісанне вучнямі сачыненняў-разважанняў, эсэ, рэпартажаў, дзе яны яшчэ раз могуць выказаць свае думкі па пытаннях, якія разглядаліся на ўроку: «Прыклад маіх бацькоў», «Чалавек у лабірынце прафесій», «Гуманізм – сіла сучаснасці?», «Зло вакол нас», «Філасофія майго жыцця», «Што я думаю пра адданасць сваёй справе?», «Што такое маральны выбар?» і іншыя. Накіроўваць вучняў да асабістага духоўнага развіцця можна не толькі на ўроках літаратуры, але і ў пазакласнай выхаваўчай рабоце. Гэта могуць быць класныя гадзіны на тэмы: «Адшукай сакрэт у сабе», «Што я бяру з сабой у жыццё?», «Што мне трэба для шчасця?», «Дзённікі вялікіх людзей», «Чалавек, якім я захапляюся» і іншыя. Эфектыўнай формай самапазнання з’яўляецца вядзенне «Дзённіка саманазірання» ці «Вучнёўскага партфоліа», дзе вучні раскажуць пра свой жыццёвы вопыт самаразвіцця, пра свае моцныя і слабыя бакі, прычыны поспеху і няўдач.